Казка “Музыкі” (5 клас, 1 чвэрць, кастрычнік)

Тып урока: вывучэнне новага матэрыялу.

Мэты: прааналізаваць паводзіны персанажаў казкі, падагульніць веды вучняў пра народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці.

Задачы: пазнаёміць са зместам казкі, развіваць уменне аналізаваць твор, выхоўваць пачуццё адказнасці і ўзаемадапамогі.

Абсталяванне: вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 5-га класа, ілюстрацыі галоўных герояў.

Форма правядзення: урок-дыялог.

**Ход урока.**

I. **Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

***Настаўнік***. У мінулы раз мы з вамі дамовіліся, што да нас на ўрок сёння завітае залаты птах. Вам патрэбна было падрыхтаваць для яго залатыя пёры (на дошцы намалявана птушка).

II. **Праверка дамашняга задання** (падрабязны пераказ аднаго з выбраных эпізодаў казкі “Залаты птах”; вучань прымацоўвае сваё падрыхтаванае папяровае пяро на дошку і пераказвае ўрывак).

***Настаўнік.***

- Якім у нас атрымаўся залаты птах? (прыгожы, цудоўны, вялікі)
- Калі ў казцы галоўны герой птах, птушка, мядзведзь або воўк, то да якога віду казак трэба аднесці гэты твор? (казкі пра жывёл).

III. **Паведамленне тэмы ўрока, мэтавызначэнне. Чытанне настаўнікам казкі “Музыкі”.**

**Эўрыстычная гутарка па змесце твора. Эпізод першы. Знаёмства з галоўнымі героямі**

***Настаўнік.***

- Назавіце галоўных герояў казкі (асёл, сабака, кот, певень).
- Па якой прычыне ( чаму?) гаспадары павыганялі іх з двароў? (таму што яны пастарэлі)
- Калі гаспадары павыганялі галоўных герояў казкі з двароў, то кім яны сталі? (бяздомнымі). Хто такія бяздомныя? (тыя, у каго няма дома)
- Чаму бяздомныя вырашылі стаць музыкамі? (усім спадабалася такая прапанова, бо кожны з іх у душы лічыў сябе артыстам)
- Дакажыце, што асёл, сабака, кот і певень – артысты (“певень спявае змалку, кот таксама; сабака не толькі гаўкае, але і выць умее; асёл наогул лічыў, што з яголым голасам можна на любой сцэне выступаць”).
- Хто такія артысты, артыст? (той, хто займаецца выкананнем твораў мастацтва перад публікай (спявак, акцёр, музыкант); маюць прыгожы голас, талент)
- Як называецца музычная група, у складзе якой чатыры чалавекі? (квартэт)
- Ці згодны вы з тым, што нашы галоўныя героі – сапраўдныя артысты? (не або так)
- Дакажыце, што сапраўды галоўныя героі не былі артыстамі.

***Чытанне па ролях ў пары+імправізацыя (па ланцужку).***

-І-і-і! (*1 вучань імправізуе*) →узяў самую высокую ноту асёл (*2 вучань выразна чытае);*

*2 пара*. -Ку-ка-рэ-ку! → падхапіў певень і захлопаў крыламі;

*3 пара*. -Гаў-гаў-гаў! → забрахаў што ёсць моцы сабака;

*4 пара.* -Мяў-мяў-мяў! → заенчыў кот;

***Настаўнік.***

- Якія часціны мовы выкарыстоўвае аўтар, каб паказаць спевы музыкаў? (дзеясловы ўзяў, падхапіў, захлопаў, забрахаў, заенчыў)
- Як адрэагіравалі лясныя насельнікі на такі канцэрт? (ніколі не чулі лясныя насельнікі такога канцэрта)

***Чытанне па ролях ў пары+імправізацыя.***

*5 пара*. Дзікі і ласі, ваўкі і мядзведзі → забіліся ў непраходныя нетры;

*6 пара*. Вавёркі → схаваліся ў дуплах;

*7 пара*. Мышы → прыціхлі ў норках;

*8 пара.* Птушкі → шуганулі з дрэў;

*9 пара*. Разбойнікі → выскоквалі праз вокны і дзверы і беглі куды вочы глядзяць.

***Настаўнік.***

- Ці падцвярджаецца наша меркаванне, што звяры сапраўды не былі артыстамі? (так, галоўныя героі  не былі артыстамі. У іх не было суладжанасці ў спевах, не было аднолькавай танальнасці, у іх былі розныя галасы, іх спевы не спадабаліся нікому: ні птушкам, ні звярам, ні нават разбойнікам)
- А як аднесліся самі музыкі да сваіх спеваў? Пракаменціруйце душэўны стан спевакоў (захапіліся канцэртам, нічога ,  вакол сябе не заўважалі, канцэрт прайшоў на славу).
- Некаторыя з вас палічылі галоўных герояў артыстамі. Чаму? (таму што яны “спявалі” сваімі галасамі і ім гэта падабалася)

  Ці можам мы меркаваць, што спяваюць не толькі артысты, а спяваюць усе, у каго добры настрой? Што даюць спевы чалавеку? (сапраўды, спяваюць не толькі артысты; чалавек спявае, калі ў яго ўсё добра, калі яго перапаўняюць станоўчыя эмоцыі, але бывае і так, што чалавек пачынае спяваць, каб пазбавіцца ад чагосьці непрыемнага; спевы дапамагаюць чалавеку разняволіцца, адчуць сябе шчаслівым, забыць негатыў)

**Эпізод другі. Героі ў хаце.**

***Настаўнік.***

- Як паводзілі сябе музыканты ў хатцы? (наеліся, напіліся, пачалі ўладкоўвацца нанач)
- Якое месца выбраў кожны з галоўных герояў?

***Чытанне дыялога па ролях.***

- Я заўсёды ля плота сплю і сёння там лягу, - сказаў асёл.
- А я каля дзвярэй лягу, - азваўся сабака.
- Мне будзе зручней спаць на прыпечку, - падаў голас кот.
- Уладкуюся на жэрдачцы пад страхой, - прамовіў пеўнік.



***Настаўнік.***

- Чаму іменна такія месцы выбралі асёл, сабака, кот і певень? Перакладзіце на рускую мову словы плот, страха. Растлумачце лексічнае значэнне слова прыпечак.
- Паспрабуйце пераказаць эпізод, калі разбойнік трапіў ноччу ў хату.

Табліца-падказка.

| *Што рабілі звяры* | *Што падалося разбойніку* |
|---|---|
| кот учапіўся кіпцюрамі ў руку | “нехта шась мне па руцэ” |
| сабака пачаў кусаць | “нехта па назе шабляй агрэў” |
| певень дзёўб у галаву | “д’ябал кап’ём у галаву тыкаць пачаў” |
| асёл штурхнуў разбойніка нагою | “нехта як перацягне даўбешкай” |

- Чаму разбойнік перабольшаў усё, што з ім здарылася? Якую прыказку ўспомнім? (цёмна было, таму спужаўся; “у страха вочы вялікія”)
- Як вы думаеце, чаму разбойнікі пакінулі абжытыя мясціны? (думалі, што там невядомая сіла пасялілася, спалохаліся), а што набылі нашы сябры? (дом)
- Як мы ахарактарызуем галоўных герояў? (яны смелыя, бясстрашныя, увесь час трымаліся разам)

**Эпізод трэці. Міні-праект “Музыкі”.**

Асёл
Сабака } звяры → бяздомныя → артысты → сябры→ набыццё дома.
Кот
Певень

**V. Пастаноўка праблемных пытанняў.**

1. Чаму вучыць казка? (нягоды лягчэй перажыць разам, дапамагаючы адзін аднаму, не адчайвацца; сапраўдныя сябры не скажуць, што ў цябе дрэнны голас, што ты не ўмееш спяваць; паважаць адзін аднаго, прыходзіць на дапамогу)

2. Ці правільна паступілі гаспадары, выгнаўшы сваіх звяроў, яны ж ім служылі верай - праўдай усё жыццё? Якія рысы характару маюць такія гаспадары? Якую прыказку мы ўспомнім, характарызуючы сітуацыю? ( гаспадары паступілі няправільна; калі звяры былі здаровыя, поўныя сіл і моцы, то яны былі патрэбныя сваім гаспадарам, а калі пастарэлі, то іх выгналі, хаця ў гэты момант ім, як ніколі, патрэбна была дапамога; гаспадары праявілі сябе эгаістамі ў дачыненні да сваіх верных служак; прыказка: “Мы ў адказе за тых, каго прыручылі”)

3. Хто быў самы галоўны ў камандзе? Чаму? (асёл, бо “ самы разважлівы з іх”, “асёл ішоў наперадзе”, таму што ён самы большы; большы прыходзіць на дапамогу меншаму, малыя інстыктыўна падпарадкоўваюцца дужэйшаму, у камандзе заўсёды ёсць лідар)

4. Што ўвасабляюць сабою асёл, сабака, кот і певень? (сяброўства, моц, адданасць, сям'ю, перамогу над разбойнікамі. "А сябры-музыкі пасяліліся ў той хатцы і сталі жыць-пажываць, бяды не ведаць")

5. Як вы думаеце, калі б гаспадары не выгналі сваіх жывёл, то што б атрымалася? (не былі бяздомнымі, але і не сталі б музыкамі і не знайшлі б сабе сяброў)

6. А што зрабілі б мы, калі б апынуліся на месцы бяздомных? Як адчувае сябе чалавек у такой сітуацыі?

7. Як мы патлумачым словы прыказкі:"Не было шчасця, дык няшчасце дапамагло" ў дачыненні да нашых герояў? (звярам не было шчасця, бо іх выгналі з дому, яны трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, але праз некаторы час звяры, сустрэўшыся, набылі і дом, і сяброў, і разуменне таго, што яны патрэбны адзін аднаму)

***Настаўнік падагульняе***. Сапраўды, галоўныя героі апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, але не апусцілі рукі. Знайшлі сяброў, перамаглі ворагаў, набылі новы дом і зажылі шчасліва. І гэта для нас будзе арыенцірам у далейшым жыцці – ніколі не адчайвацца, заўсёды ёсць людзі, якія працягнуць руку дапамогі.

**VI. Сістэматызацыя і падагульненне вывучанага. Віктарына "Казка побач".**

**1 блок пытанняў.**

1. Сюжэт беларускай народнай казкі "Музыкі" падобны да літаратурнай казкі.. (братоў Грым "Брэменскія музыкі")
2. Назавіце адметнасці будовы казкі "Музыкі".. (традыцыйны зачын і сталая канцоўка)
3. Да якога віду казак адносіцца казка "Музыкі"? (пра жывёл)
4. Хто лічыцца самым разважлівым у казцы? (асёл)
5. Хто "спявае змалку"? (певень)
6. Хто лічыў, "што з ягоным голасам можна на любой сцэне выступаць"? (асёл)
7. Куды забіліся лясныя насельнікі, калі пачулі герояў-артыстаў? (у нетры)

8. Што дастаў з печы разбойнік? (смалячок)

9. Чым учапіўся кот у руку разбойніка? (кіпцюрамі)

10. Праз што пераскочыў разбойнік уцякаючы? ( праз плот)

**2 блок пытанняў.**

1. Фальклор у перакладзе з англійскай мовы – гэта.. (народная мудрасць)
2. Адгадайце загадку: “Што на свеце шпарчэй за ўсё?”(думка)
3. Якія віды казак бываюць? (чарадзейныя, бытавыя і пра жывёл)
4. Што бярэ з сабою ў дарогу Іван – галоўны герой казкі “Залаты птах”? (птушынае пяро, кій і ножык-сцізорык)
5. “Прыставіў увечары Сцяпан да яблыні..” (драбіны)
6. Хто выратаваў жыццё Івану? (ваўчыха)
7. Якой масці (колеру) была цялушачка ў казцы “Разумная дачка”? (гнядой)
8. Які выкуп прапанаваў каралю Іван за сваіх братоў? (меч бразгучы)
9. Што заўсёды перамагае ў казках? (дабро)
10. Трохразовыя паўторы дзеяння, традыцыйныя рыфмаваныя зачыны, сталая канцоўка – гэта … (будова казак)

**VII. Каменціраванне і выстаўленне адзнак.**

**VIII. Дамашняе заданне** (на выбар)

1.Скласці план казкі “Музыкі” і падрыхтаваць пераказ.

2. Адказаць на пытанні падручніка.